WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 чэрвеня 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 117 (26981)
Кошт 750 рублёў

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «СПАДЧЫНА ГЕРОЯЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ — КРАЕВУГОЛЬНЫ КАМЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка вечарам 22 чэрвеня ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» прыняў удзел у памятных мерапрыемствах, прысвечаных 70-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы ўсклаў вянок да скульптурнай кампазіцыі «Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у неўміручасць зрабілі крок», што адкрылася ў Брэсцкай крэпасці. Да п'едэстала кампазіцыі таксама леглі кветкі ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікоў пагранічных ведамстваў краін СНД, Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў баявыя сцягі воінскім часцям пагранслужбы Беларусі, пасля чаго сустрэўся з ветэранамі. Ён таксама наведаў Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор, дзе запаліў свечку ў памяць аб ахвярах вайны.

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з расійскімі журналістамі — удзельнікамі прэс-тура ў Беларусь, якія прысутнічалі на мерапрыемстве. Адзін з журналістаў пацікавіўся ў Аляксандра Лукашэнкі, што для яго Вялікая Айчынная вайна і паняцце памяці. «Наша Вялікая Перамога — гэта наш вялікі здабытак — Беларусі, Расіі, Украіны і ўсяго Савецкага Саюза, савецкіх людзей, ды і не толькі. Гэты вялікі здабытак апошнім часам у нас паціху спрабуюць адабраць. Нас ужо абвінавачваюць у тым, што мы вайну развязалі. Хто сёння сумняваецца ў тым, што гэта хочуць аддаць забыццю і адабраць у нас гэту Перамогу — наш вялікі здабытак? Сёння ніхто ў гэтым не сумняваецца. Мы аддаць гэта не павінны!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, асабліва ярка гэта праяўляецца адносна Беларусі. «Нас сёння спрабуюць нахіліць. На жаль, і ў Расіі нямала такіх, і, асабліва, на Захадзе. Нас хочуць навучыць, а я ім нагадваю: сябры мае, у нас яшчэ не памерла пакаленне не толькі франтавікоў, але і тых, хто быў дзецьмі ў гады вайны, шмат тых, хто памятае тую заслугу і вялікую ролю, якую адыграў савецкі народ у вызваленні свету ад карычневай чумы».

«Хто нас сёння спрабуе вучыць? Тыя, якія або на калені сталі перад фашыстамі, або тыя, хто трэцюю частку нашага насельніцтва ў Беларусі загубіў. Таму, перш чым нас вучыць і нахіляць, вы, калі ласка, аддайце даніну павагі не толькі савецкаму народу ў цэлым, але і беларусам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што абсалютная большасць расіян у выпадку неабходнасці стануць у адзін строй з беларусамі, абараняючы сваю Бацькаўшчыну. «Тут была апора нашай Айчыны, яна і будзе».

Выступаючы перад пачаткам канцэрта-рэквіема майстроў мастацтваў Беларусі і Расіі, які прайшоў на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў шэрагу дзяржаў мэтанакіравана і свядома вытраўляецца гістарычная праўда. «У галовы моладзі ўбіваюцца цалкам скажоныя паняцці пра дабро і зло. У грамадстве насаджваецца новая мараль, якая апраўдвае агрэсію і дамінаванне адных дзяржаў над іншымі».

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем канстатаваў, што сёння ў некаторых «суперцывілізаваных і ахопленых дэмакратыяй краінах» савецкіх салдат ставяць на адну дошку з фашыстамі, над імі праводзяць паказальныя суды. «Наўрад ці байцы Ягораў і Кантарыя, якія ўзнялі чырвонае палотнішча над пераможаным рэйхстагам, маглі ўявіць, што Чырвоны Сцяг Перамогі будзе забаронены. Але сёння таму ёсць маса прыкладаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Наўрад ці доблесны ветэран вайны, які крывёй заслужыў свае ўзнагароды, мог уявіць, што яму будуць пляваць у твар і зрываць з яго грудзей ордэны і медалі. Але ж менавіта так паводзяць сябе нахабныя малойчыкі ў краінах «дэмакратыі».

СТАР. 2

**Удзельнікам VI Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне»**

***Паважаныя сябры!***

*Сардэчна вітаю вас, вядомых журналістаў, палітолагаў і экспертаў краін СНД і далёкага замежжа, на нашым медыяфоруме.*

*У сучасным свеце роля сродкаў масавай інфармацыі вялікая і адказная. Бо яны не толькі выказваюць, але і фарміруюць грамадскую думку. Галоўныя прынцыпы, якімі павінны кіравацца журналісты сёння, — праўдзівасць, непрадузятасць і павага да законаў краіны і маральных каштоўнасцяў народа.*

*Безумоўна, форум стане знакавай падзеяй у жыцці медыйнага супольніцтва, а вашы прапановы паслужаць пашырэнню і ўмацаванню міжнароднага супрацоўніцтва, распаўсюджванню аб'ектыўнай інфармацыі пра Беларусь.*

*Зычу вам плённых стасункаў, яркіх змястоўных дыскусій і стваральных ідэй. Няхай актыўная грамадзянская пазіцыя кожнага з вас заўсёды будзе асновай вашай творчасці на ніве журналістыкі.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

БЕЛАРУСБАНК

**С 27 июня 2011 года**
**ОАО «АСБ Беларусбанк»**
**УВЕЛИЧИВАЕТ ПРОЦЕНТНЫЕ СТАВКИ**
**по вкладам в белорусских рублях**
**и устанавливает их в следующих размерах:**

**по срочному банковскому накопительному вкладу** в белорусских рублях – в размере **26,5 процента годовых** (как по вновь принимаемым, так и по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность);

**по срочному банковскому вкладу «Новый 2010»** фиксированный общий доход в течение первых 3-х месяцев хранения вклада – в размере **26 процентов годовых** (по вновь принимаемым вкладам);

**по срочному банковскому вкладу «Гарантированный доход»** на 15 дней – в размере **22 процентов годовых** (по вновь принимаемым, а по ранее принятым вкладам – с даты переоформления, начиная с 27.06.2011).

С 27.06.2011 банк приостанавливает прием денежных средств на новые срочные банковские вклады «Престиж». По принятым до указанной даты вкладам **«Престиж»**, по которым не начисляется пониженный доход, с 27.06.2011 устанавливается доход в размере **23 процентов годовых.**

С 27.06.2011 ОАО «АСБ Беларусбанк» выпускает в обращение **сберегательные сертификаты** со сроком обращения 2 месяца и устанавливает с 27.06.2011 по вновь оформляемым сертификатам:

- со сроком обращения **15 дней** процентную ставку в размере **22 процентов годовых**;

- со сроком обращения **2 месяца** – в размере **23 процентов годовых**.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам, опубликована в газете «Звязда» № 104 (26968) за 9 июня 2011 г., а также размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША АБВЯСЦІЛІ ПРА ВЫВАД ВОЙСКАЎ З АФГАНІСТАНА

Прэзідэнт ЗША Барак Абама выступіў з тэлезваротам да амерыканскага народа і абвясціў пра вывад да лета 2012 года 33 тыс. вайскоўцаў з Афганістана, трэць з якіх вернецца на радзіму да канца гэтага года, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле слоў Барака Абамы, з 2014 года афганскі народ будзе несці адказнасць за ўласную бяспеку. У Афганістане ЗША ваююць без малога 10 гадоў.

### НА ЧЭХІЮ АБРЫНУЛІСЯ ТАРНАДА

Некалькі моцных тарнада абрынуліся ўчора на ўсход Чэхіі. Як паведамляюць інфармагенцтвы, віхураслупы пранесліся ў Пардубіцкім краі, прычыніўшы шкоду некалькім населеным пунктам. Так, у мястэчку Старэ-Чывіцэ ў некалькіх дамоў былі сарваны дахі, парушана электразабеспячэнне. Інфармацыя пра пацярпелых не паступала.

### ЛЮБІМАЯ ПАДУШКА — ПАТЭНЦЫЙНЫ ВОРАГ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

Група даследчыкаў пад кіраўніцтвам доктара Арта Такера са шпіталя Сен-Бартс правяла аналіз і высветліла, што звычайная сярэднестатыстычная падушка хавае ў сабе кляшчоў, алергены і мікробы. У выніку чалавек пачынае хварэць, не разумеючы, у чым прычына яго недамагання. Такім чынам, праз два гады з моманту пачатку выкарыстання падушкі больш за адну траціну яе вагі прыпадае на жывых ці мёртвых кляшчоў, на прадукты іх жыццядзейнасці і бактэрыі. Прытым, насуперак распаўсюджанай думцы, менавіта сінтэтычныя падушкі бруднейшыя за пёравыя і пуховыя. Асаблівую небяспеку ўяўляюць падушкі ў бальніцах. Эксперты прапануюць у медустановах укараніць адмысловую антыбактэрыяльную разнавіднасць стандартных падушак, герметычна запячатаную. Арт Такер падкрэслівае: ні адбельванне, ні магутныя пральныя сродкі не забіваюць кляшчоў. Праўда, мыццё пры тэмпературы вышэй за 60 градусаў можа дапамагчы. Дарэчы, кляшчы жывуць у цёплым, вільготным асяроддзі, але сохнуць і паміраюць пад уздзеяннем сонечных промняў. Значыць, мае сэнс вярнуць ва ўжытак старую практыку праветрывання і прасушкі падушак на сонцы.

ISSN 1990 - 763X

**Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»**

**состоится 7 июля 2011 года в 11.00 по адресу:**
г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

Повестка дня:

1. О согласовании участия генерального директора ОАО «Белгорхимпром» в совете директоров ОАО «Трест Шахтоспецстрой».

Регистрация акционеров – в день проведения собрания ***с 9.00 до 10.30*** по адресу:
г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712

Кропка на планеце

## КАРМЯНСКІ КАЎКАЗ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**КАЎКАЗ сустракае цішынёю і водарам квітнеючай акацыі. Цішыня ўласцівая кожнай вёсцы, але не настолькі. Вёска, можна лічыць, прывід, бо стаяць хаты, абнесеныя плотам, але да іх няма сцежак, не бачна слядоў. Але куды вядзе ледзь прыкметная ў высокай траве каляіна аўтамабільных колаў? Ледзь не крадучыся, кірую па ёй і трапляю на сонечную паляну, якая ўтульна прымасцілася каля бярозавага гаю. Першы чалавек, якога сустракаю ў вёсцы з нетрадыцыйнай назвай, завіхаецца каля пчол. Па колькасці вулляў можна адразу вызначыць, што мядовая справа тут пастаўлена на добры лад.**

**«У вёсцы Каўказ стала жыве толькі адзін чалавек, ды і той нетутэйшы. А я толькі разводжу пчол, а сам жыву ў Карме, — кажа Андрэй Цітоў, зусім не баючыся без пчалярскай ахоўнай амуніцыі знаходзіцца каля пчол. І таму адразу відаць, што ён — спецыяліст гэтай справы.**

СТАР. 8

# СПАДЧЫНА ГЕРОЯЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ — КРАЕВУГОЛЬНЫ КАМЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Прэзідэнт Беларусі лічыць самым верхам подласці і цынізму ўшанаванне баевікоў «Вафен-Эс-Эс», чые рукі пакрыты крывёю мірных жыхароў, вязняў канцлагераў. На думку кіраўніка дзяржавы, на свяшчэннай Брэсцкай зямлі, якая першай прыняла на сябе ўдар фашысцкай арміды, асабліва яўна адчуваецца пасланне з мінулага. «Яго сутнасць — у закліку сапраўднага антыфашыста Юліуса Фучыка: «Людзі, будзьце пільнымі!». Не дапусціце адраджэння нацызму, ксенафобіі, расавай і рэлігійнай нецярпімасці, паўтарэння жахаў вайны. Не спакушайцеся на салодкія прамовы адвакатаў новых «крыжовых паходаў» супраць суверэнных народаў і дзяржаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт перакананы, што гэты наказ мы абавязаны перадаць нашчадкам, бо сёння ён актуальны, як ніколі. У розных рэгіёнах планеты зноў гінуць людзі, бушуюць ваенныя канфлікты і сацыяльныя катаклізмы. «Цяперашнія геапалітычныя стратэгі спрабуюць перакройваць сусветную карту паводле свайго меркавання і вызначаць «зоны сваіх нацыянальных інтарэсаў» там, дзе ім уздумаецца. Вайна для іх ператварылася ў картачную гульню», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што для беларускай дзяржаўнасці спадчына герояў з'яўляецца краевугольным каменем, і беларусы не дапусцяць рэвізіі вынікаў мінулай вайны. «Мы будзем заўсёды выхоўваць нашу моладзь на прыкладах павагі да слаўнага мінулага, гуманізму, патрыятызму і чалавекалюбства. Мы ніколі не станем іванамі без роду і племені, якія не памятаюць усіх, хто пакутаваў, змагаўся і перамог», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

«Наша маладая незалежная дзяржава нікому не пагражае, а наадварот — актыўна выступае за стварэнне ўсёабдымнай сістэмы бяспекі і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Згадваючы адну з самых трагічных дат нашай гісторыі — 22 чэрвеня 1941 года, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі б тады шматнацыянальны савецкі народ не з'яднаўся ў барацьбе з агульным ворагам, чалавецтва апынулася б у беспрасветным фашысцкім рабстве.

Глыбока сімвалічна, на яго думку, што памятныя мерапрыемствы, прысвечаныя 70-й гадавіне пачатку Вялікай Айчыннай вайны, праходзяць у Брэсцкай крэпасці. «Не толькі таму, што тут пачалася вайна. Але і дзеля таго, каб яшчэ раз нагадаць усім: шлях да Вялікай Перамогі пачынаўся адсюль! Ад гэтых старых сцен, дзе плавіўся камень, але цвярдзелі сэрцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Дарагую цану заплаціла Беларусь за Перамогу і за Свабоду. У той жудаснай вайне загінула, скалечана трэць нашага насельніцтва. Была поўнасцю разбурана эканоміка, разграмлены і разрабаваны культурны здабыткі народа. Беларусь сцерлі з карты планеты», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Аднак беларусы не пакарыліся агрэсару. «Калі настаў час выпрабаванняў, нашы мірныя людзі — мужчыны, жанчыны, нават дзеці — паказалі ўсяму свету ўзоры мужнасці, стойкасці і патрыятызму. Мы тады здзейснілі другі подзвіг — працоўны подзвіг, аднавіўшы з руін і попелу нашу зямлю. Усё гэта называецца беларускі характар», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што беларусы заўсёды будуць удзячны пакаленням, якія прынялі на сябе страшны ўдар вайны, але не схілілі галовы і не сталі на калені. «Ветэраны ў нашай краіне акружаны пашанай і дзяржаўным клопатам. Яны — наша духоўная апора, аснова грамадзянскай супольнасці», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што спадчына герояў з'яўляецца краевугольным каменем беларускай дзяржаўнасці, дадаўшы, што беларусы ніколі не дапусцяць рэвізіі вынікаў мінулай вайны. «Мы не аддадзім забыццю нашы брацкія магілы, масавыя пахаванні, нашы мемарыялы — ад грандыёзнай у сваім трагізме Хатыні да магілы невядомага салдата», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, увекавечанне памяці аб подзвігу абаронцаў Айчыны з'яўляецца справай агульнанацыянальнага значэння. Увасабленнем удзячнасці пакаленню пераможцаў стане буйнейшы ў Еўропе новы Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які ўзводзіцца ў горадзе-героі Мінску.

«Сёння мы адкрываем манумент у гонар абаронцаў граніцы і членаў іх сем'яў, якія падзялілі лёс сваіх мужоў і бацькоў», — адзначыў Прэзідэнт, выказаўшы шчырую ўдзячнасць пагранічнікам рэспублік былога Савецкага Саюза, якія таксама прынялі ўдзел у стварэнні гэтага манумента.

«Мы разумеем, што быць дастойнымі пакалення, якое выратавала чалавецтва ад фашызму, — значыць усімі сіламі берагчы мір на Зямлі. Таму заклікаем не забываць традыцый дружбы і братэрства з народамі былога Савецкага саюза, з якімі 70 гадоў таму ў адзіным страі ўзняліся на свяшчэнную барацьбу з фашызмам», — адзначыў Прэзідэнт.

Пасля заканчэння выступлення Аляксандр Лукашэнка ўручыў дырэктару мемарыяльнага комплексу ветэрану Вялікай Айчыннай вайны і ваеннаслужачаму пагранічнай службы Беларусі памятны меч, выраблены Златавустаўскай зброевай кампаніяй для Брэсцкай крэпасці-героя. Гэты памятны меч прысвячаецца Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і сімвалізуе нязломны дух, з'яднанасць і гераізм савецкага народа.

Потым кіраўнік дзяржавы прайшоў у глядзельную залу для прагляду канцэрта-рэквіема. Пасля яго заканчэння ўдзельнікам канцэрта быў паднесены кошык кветак ад імя Прэзідэнта Беларусі.

# БЕЛАРУСЬ ПЛАНУЕ ЗВЯРНУЦЦА Ў МІЖНАРОДНЫЯ СУДЫ З ІСКАМІ НАКОНТ САНКЦЫЙ ЕЎРАСАЮЗА

**Аб гэтым учора, адказваючы на пытанні журналістаў у ходзе рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, перадае БЕЛТА.**

«Гэта бязглуздая, непрадуманая палітыка», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, гаворачы аб санкцыях Еўрасаюза адносна Беларусі. «Я хачу даручыць сваім юрыстам, у нас дастаткова спецыялістаў, — мы павінны гэту праблему разглядзець юрыдычна праз адпаведныя суды, прад'явіць іскі тым, хто ўводзіў не толькі эканамічныя санкцыі, але і адносна журналістаў». Ён адзначыў, што журналіст выказвае свой пункт гледжання, сваю пазіцыю. «Якое ты маеш права, дэмакратычная краіна, судзіць журналіста за яго пазіцыю? За што вы сёння асобным журналістам закрылі ўезд у Еўрасаюз?». Што датычыцца санкцый адносна чыноўнікаў, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Прычым тут людзі, якія працуюць ва ўладзе, але наогул не мелі дачынення да выбараў, тым больш да 19 снежня? Да 19 снежня мелі дачыненне максімум пяць чалавек (Прэзідэнт, міністр унутраных спраў і іншыя). Іх і прыцягвайце да адказнасці, калі лічыце патрэбным, але прычым тут гэтыя людзі? Якое вы маеце права аб'яўляць неўязнымі суддзяў? Вы ж выступаеце за незалежны суд».

«Нашым юрыстам трэба сур'ёзна ўзяцца за гэта пытанне, і няхай даюць тлумачэнні — тлумачэнняў у іх аб'ектыўных няма. Калі суд адпаведны, куды мы звернемся, не прыме гэта рашэнне *(на карысць Беларусі. — Заўвага БЕЛТА)* — значыць, такі гэта суд на Захадзе. Яны сябе ў гэтым плане загналі ў далёкі кут», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Аляксандр Лукашэнка не ведае, чаму Дзмітрый Мядзведзеў не адгукнуўся на запрашэнне прыехаць у Брэст 22 чэрвеня

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што сапраўды запрашаў свайго калегу з Расіі прыбыць у Брэст — крайні пункт нашай агульнай Айчыны. На яго думку, 70-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны — гэта падстава для таго, каб разам, як гэта было тады, прадэманстраваць і расіянам і беларусам, што «ў нас агульная памяць і мы заўсёды будзем разам». Зыходзячы з гэтага, Аляксандр Лукашэнка і запрасіў свайго расійскага калегу прыехаць у гэты дзень у Брэст. «Чаму не прыехаў? Трэба гэта пытанне адрасаваць яму. У мяне на гэта пытанне канкрэтнага адказу няма. Я на гэту тэму з ім не размаўляў пасля таго, калі яму было адпраўлена запрашэнне прыехаць у Брэст». Ён дадаў, што Барыс Ельцын і Уладзімір Пуцін тут былі, гэта значыць абодва папярэднія Прэзідэнты Расіі падкрэслівалі важнасць апошняга метра нашай агульнай Айчыны, і ў прыватнасці Брэсцкай крэпасці.

«Лічу гэта абсалютна нармальным, што запрасіў Прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева. Чаму не прыехаў — не ведаю», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Пётр Пракаповіч больш не вернецца ў Нацбанк, але будзе задзейнічаны ў інтарэсах дзяржавы

пасля праходжання медыцынскай рэабілітацыі.

«Пётр Пракаповіч у Нацыянальны банк больш не вернецца, я хачу, каб ён жыў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта чалавек, вельмі адданы сваёй краіне, сумленны і прыстойны». Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў: «І ён памыляўся, і ўрад, і я павінен гэта бачыць». «Гэта верны нашай Айчыне чалавек. Але цяжка нават было б уявіць, што перанёсшы аперацыю на адкрытым сэрцы, ён літаральна на наступны дзень выйшаў бы на работу, — працягнуў Аляксандр Лукашэнка. — Таму мы з ім дамовіліся: ён будзе задзейнічаны ў краіне па поўнаму пасля праходжання медыцынскай рэабілітацыі».

## Эканамічныя санкцыі Еўрасаюза не пагоршаць сітуацыю ў Беларусі

Каментуючы ўведзеныя Еўрасаюзам санкцыі адносна шэрагу беларускіх кампаній, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Яны *(кампаніі. — Заўвага БЕЛТА)* нібыта фінансуюць урад. Дакажыце. Гэта нягоднікі і падонкі. Пакладзіце на стол дакументы, што гэтыя кампаніі фінансавалі хоць каго-небудзь з урада. Неадкладна мною будуць прыняты меры. Калі гэта мяне датычыцца, я ўжо даўно гаварыў, знайдзіце гэтыя грошы і забярыце. Калі пакладзіце дакументы, што яны фінансуюць Прэзідэнта або яшчэ некага каля Прэзідэнта, імгненна будзе прынята рашэнне». «Гэта дробныя блышыныя ўкусы. Яны ніколі не даюць карысці ні ім, ні нам». «Але калі яны нас будуць тузаць з пункту гледжання эканомікі, мы таксама знойдзем чым адказаць. У нас нямала кампаній працуюць тут і ўласнасць, па якіх мы вельмі балюча можам ударыць». «Я не хачу гэтай эскалацыі, таму на гэта не адказваю, паколькі гэтыя санкцыі сітуацыю ў краіне не пагоршаць. Яны проста паказваюць, які сёння свет і якая дэмакратыя на Захадзе».

## Беларусь пабудуе другую калійную вытворчасць з прыцягненнем інвестыцый у аб'ёме $2 млрд

«Мы будуем другі калійны камбінат пад $2 млрд інвестыцый. І калі ўрад церпіць, што там у іх менш як 1 працэнт *(ад гадавога плана па прытоку прамых замежных інвестыцый. — Заўвага БЕЛТА)*, няхай хутчэй дамаўляюцца з інвестарам і падпісваюць інвестыцыйны праект».

Кіраўнік дзяржавы таксама не выключыў магчымасці будаўніцтва трэцяй калійнай вытворчасці: «Калі ўсё нармальна ў нас атрымаецца з вызначанымі пытаннямі — мы трэцюю калійную вытворчасць пачнём будаваць. Гэта зноў $2 млрд».

## Аляксандр Лукашэнка называе балбатнёй заявы аб тым, што Беларусь зарабляе на гандлі зброяй $1,8 млрд

«Калі мы будзем зарабляць на гандлі зброяй $1,8 млрд, я буду шчаслівым Прэзідэнтам, і ў нас не будзе гэтых праблем. У нас дадатнае сальда было б дакладна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Балбатня гэта бесталковых, непрафесіянальных і неразумных людзей», — так Аляксандр Лукашэнка па просьбе прадстаўнікоў СМІ пракаментаваў заявы некаторых дыпламатаў, якія пажадалі застацца невядомымі. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Расія, якая шмат чаго вырабляе ў гэтай сферы, зарабляе ад гандлю зброяй каля $5 млрд. «Мы амаль нічога не вырабляем. Калі $1,8 млрд зарабляем — я таксама магу з імі падзяліцца».

## Аляксандр Лукашэнка лічыць, што некаторыя апазіцыйныя палітыкі плануюць выкарыстаць несанкцыянаваныя акцыі, каб прарвацца ва ўладу

«Можа хтосьці і незадаволены. У гэтым і сутнасць дэмакратычнага грамадства. Але гэта незадаволенасць павінна вылівацца ў законным парадку. Ёсць месцы — ідзіце тупайце, улюлюкайце, крычыце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён адзначыў: «Трэба мець на ўвазе, што за спінай у гэтых дзеячаў, яны ўжо свецяцца, ім мала было судоў і адной нагой у турме, яны яшчэ туды ходзяць і падбухторваюць гэту моладзь, гэтых хлапчукоў». «Яны чакаюць, каб сабраць крытычную масу, а потым гэта гарматнае мяса наперадзе сябе пусціць і на іх спінах ускочыць ва ўладу. Мы гэта добра бачым і разумеем. Таму гэтага каня мы ім асядлаць не дадзім».

## Аляксандр Лукашэнка лічыць, што сказаць людзям праўду важней, чым яго ўласны рэйтынг

«Калі б я сказаў, што мяне не цікавіць рэйтынг, быў бы не вельмі шчыры. Для любога палітыка важны гэты рэйтынг — як вы ставіцеся да мяне, як народ да мяне ставіцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў, што ёсць аб'ектыўныя законы, асабліва ў эканоміцы. «Я як эканаміст скажу, што гэтыя эканамічныя законы, на жаль, дзейнічаюць незалежна ад нашай волі. Я гэта добра разумею, і як бы ні хацеў вам спадабацца, павінен дзейнічаць у адпаведнасці з гэтымі законамі. Гэта першае. Другое: вы думаеце, лепш было б, калі б я сказаў: заўтра ў абменніках або дзесьці будзе валюта, а на самай справе яе не будзе, што, людзі верылі б мне? Не. Я сказаў ім праўду. Прынясіце прадаваць валюту, гэта валюта ў абменніках і банках будзе, і хтосьці яе купіць. Але я сказаў — дзяржава ў гэту гульню, вобразна кажучы, пакуль гуляць не будзе — як мінімум да ліпеня».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, пасля размовы з кітайскімі і расійскімі спецыялістамі ён яшчэ раз пераканаўся, што абсалютна меў рацыю.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што калі камусьці вельмі патрэбна валюта для лячэння, дзелавых паездак за мяжу, то, напісаўшы заяву ў Беларусбанк, ён атрымае валюту. Але калі могуць пакуль пацярпець — трэба пацярпець. Тыя, каму не патрэбна валюта, не павінны хадзіць у абменнікі яе атрымліваць. «Ну навошта выводзіць валюту з эканомікі?» — слушна заўважыў Прэзідэнт.

## У Беларусі трэба больш сур'ёзна кантраляваць расходаванне валюты для насельніцтва

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на гэтай жа думцы сыходзяцца і замежныя спецыялісты. Як вядома, не так даўно Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з кітайскімі банкірамі.

«У ліпені-жніўні паглядзім, як будзе складвацца сітуацыя», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што валюту неабходна накіроўваць на развіццё прадпрыемстваў, каб атрымліваць, напрыклад, у дзесяць разоў больш валюты, прадаючы прадукцыю за мяжу. Тады і дабрабыт людзей будзе павялічвацца.

Як лічыць Прэзідэнт, трэба засвоіць галоўны выхад з існуючай панікі і ажыятажу: «Ты маеш права на валюту толькі тады, калі ты яе прывозіш у краіну. Гэта значыць усім давядзецца, мы над гэтым працуем і будзем узмацняць гэту работу, займацца імпартазамяшчэннем».

## Нацбанк будзе рухацца строга ў фарватары сацыяльна арыентаванай эканомікі

Курс Нацыянальнага банка будзе ранейшым — прыкладна такім, які мы яго вызначылі апошнім часам.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: "Цяпер мы ўсё гэта акумулюем у ліпені-жніўні і выбудуем гэту палітыку. Мы сёння маглі б ужо свабодна жыць па валюце, каб не да гэтага хаосу, гэтай панікі. Мы атрымалі пэўныя крэдыты, і не толькі з фонду ЕўрАзЭС. Але спяшацца тут нельга. Дарэчы, замежныя спецыялісты нас аб гэтым папярэджваюць: ні ў якім выпадку не спяшайцеся». Таму курс Нацыянальнага банка будзе рухацца строга ў фарватары сацыяльна арыентаванай эканомікі, сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Цяпер мы будзем спакойна жыць, цэны будзем кантраляваць, пакуль яны не стабілізуюцца». Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, «трэба спакойна жыць і за беларускія рублі купляць тое, што ёсць у магазінах».

## Прадаставіць інвестарам права карыстацца льготамі на ўмовах СЭЗ у любым рэгіёне краіны

«Трэба завяршаць нарэзку гэтых плошчаў, даць права інвестару выбіраць месца, дзе ён будзе працаваць на прынцыпах СЭЗ. Я прыхільнік таго, каб прадастаўляць канкрэтна льготы ў любым населеным пункце краіны, не толькі ў СЭЗ», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама сказаў: «Давайце паспрабуем, трэба даць новае дыханне бізнэсу. Будзем лічыць, што гэта стратэгічнае пытанне будзе вырашана, і каб яно больш не выводзілася на ўзровень Прэзідэнта».

Азнаёміўшыся з работай СП «Санта Брэмар», кіраўнік дзяржавы прыйшоў да высновы, што не бачыць мэтазгоднасці ў далейшым развіцці СЭЗ. Сам інвестар павінен выбіраць месца, дзе ён будзе працаваць. «Трэба даць свабоду інвестару, каб ён сам сказаў — я буду працаваць менавіта тут».

## Да канца года стварыць нацыянальную малочную кампанію

Кампанію плануецца стварыць на базе такіх малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў, як «Савушкін прадукт», Бярозаўскі СК, Кобрынскі МСЗ, Лунінецкі МЗ, ААТ «ГМЗ № 1» і ААТ «ГМЗ № 2». Сукупны аб'ём перапрацоўкі малака ў мінулым годзе на гэтых заводах дасягнуў 1 млн т.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў адмовіцца ад паслуг тых інвестараў, якія ў сённяшніх складаных эканамічных умовах спынілі сваю дзейнасць у Беларусі. «Тыя, хто пакінуў у цяжкую для нас хвіліну беларускі рынак, больш вярнуцца сюды не павінны, калі толькі з майго ведама, інакш буду разглядаць гэта як карупцыю. Мы будзем падтрымліваць тых, хто нас разумее». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што перавагу трэба аддаваць айчыннаму інвестару, які добра сябе зарэкамендаваў, калі ён прапануе тое ж, што і замежны інвестар.

## Аляксандр Лукашэнка лічыць нядрэннай сітуацыю ў Беларусі ў сферы прыцягнення інвестыцый

«У гэтым годзе ў нас з інвестыцыямі нядрэнна. Дай бог, каб мы змаглі гэтыя інвестыцыі забяспечыць уласнымі сіламі, я маю на ўвазе перш за ўсё будаўніча-мантажныя работы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У прыватнасці, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, з прыцягненнем кітайскага крэдыту будзе будавацца цэлюлозна-папяровы камбінат, за кошт сродкаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця плануецца пабудаваць новую аўтамагістраль з Мінска ў Гомель, намечаны і многія іншыя значныя інвестыцыйныя праекты.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што для бізнэсу патрэбна стабільнасць і парадак. Менавіта гэта, на яго думку, асабліва цэніцца інвестарамі.

## Аляксандр Лукашэнка не верыць, што Расія і ЗША змогуць дамовіцца па ПРА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не верыць, што Расія і ЗША змогуць дамовіцца па пытанні размяшчэння ў Еўропе элементаў нацыянальнай сістэмы проціракетнай абароны ЗША. «Сваю сістэму ПРА яны *(ЗША. — Заўвага БЕЛТА)* размесцяць. Упэўнены, што гэта толькі пачатак, яна будзе пашырацца і ўзмацняцца, і расіянам, а магчыма і нам, трэба будзе на гэта рэагаваць».

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

## «ЛЕТНЯЯ ШКОЛА ЖУРНАЛІСТЫКІ МОЖА АФОРМІЦЦА Ў САМАСТОЙНЫ ФОРУМ»

**Летняя школа журналістыкі ў хуткім часе можа аформіцца ў асобнае мерапрыемства. Аб гэтым заявіў міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі на адкрыцці VI Беларускага міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне», перадае БЕЛТА.**

Паводле яго слоў, Інстытут журналістыкі Белдзяржуніверсітэта з'яўляецца адным з лепшых на прасторах СНД. І Летняя школа, як плануецца, ператорворыцца ў асобнае мерапрыемства, якое, магчыма, нават стане самастойным. Акрамя таго, паводле слоў Алега Праляскоўскага, не выключаны варыянт правядзення ў Беларусі Асенняй школы маладых журналістаў краін СНД.

Ён пажадаў удзельнікам медыяфоруму творчых поспехаў і адказнасці. «Мы ведаем прыклады пазітыўнай і негатыўнай адказнасці. Журналістыка — гэта не проста аб'ектыўнае адлюстраванне рэчаіснасці», — адзначыў Алег Праляскоўскі. Паводле яго слоў, усяго некалькі слоў, сказаных журналістам, або некалькі кадраў, паказаных па тэлебачанні, могуць змяніць ход гісторыі і адносіны паміж цэлымі дзяржавамі.

Сяргей ДУБОВІК:

## «НА МЕДЫЯФОРУМЕ Ў МІНСКУ САБРАЛІСЯ ЎСЕ, КАМУ НЕАБЫЯКАВЫ ЛЁС ЖУРНАЛІСТЫКІ»

**Такую думку выказаў дырэктар Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Дубовік на адкрыцці Летняй школы журналістыкі, перадае БЕЛТА.**

«Тут сабраліся не толькі практыкуючыя журналісты з рэгіёнаў Беларусі і замежных краін, але таксама студэнты — усе, каму неабыякава будучыня журналістыкі. Праводзіць такія майстар-класы (*у рамках Летняй школы. — Заўвага БЕЛТА*) ужо стала добрай традыцыяй для нашага медыяфоруму, што ўзбагачае журналістыку, паказвае студэнтам арыенціры — тое, да чаго трэба імкнуцца», — сказаў Сяргей Дубовік.

# СЕАНС «КУЛЬТУРНАГА АДМЫВАННЯ»

**Майстар-клас пра тое, як адкрыць у сабе залежы пазітыву**

«...Сядайце, каб было ўтульна, прыміце мабільныя тэлефоны, каб не перашкаджалі. Уявіце самыя прыемныя моманты свайго жыцця. Заплюшчыце вочы. Ногі расслабленыя, рукі расслабленыя, сэрца расслабленае. Вы спакойныя. Глыбокі ўдых... Вы ўдачлівыя, у вас усё будзе атрымлівацца. На лічбе «тры» вы расплюшчваеце вочы», — кандыдат мастацтвазнаўства з Масквы Наталі Галіцына гаварыла ціха, амаль нячутна, пры гэтым вадзіла рукамі ў паветры. Так яна дэманстравала сваё ўменне працаваць з аўдыторыяй па сваёй методыцы падчас майстар-класа ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Дэманстравала не проста так — па вялікіх просьбах, таму што дагэтуль шмат казала пра пасіянарных асоб і пра тое, як імі стаць. Стаць трэба, таму што, на яе думку, менавіта на пасіянарных асобах трымаецца проза, культура і наогул свет.

— Я займаюся трансперсанальнай псіхалогіяй, яна накіраваная на тое, каб раскрываць магчымасці чалавека, якімі ён надзелены. З любога чалавека можна зрабіць пасіянарную асобу, — упэўнена Наталі Галіцына. — У нейкім сэнсе гэта самагіпноз. Калі чалавеку трэба нешта вырашыць для сябе і ён гатовы ў яго пагрузіцца, то гэта добрая сістэма выхаду са складанай сітуацыі, якая сядзіць усярэдзіне. Чалавек можа не ўсведамляць, што ў яго ёсць праблемы. Але гэтая сістэма дае магчымасць узняцца над ёй і паспрабаваць нешта вырашыць. Увогуле, сістэма трансперсанальнай псіхалогіі раскрывае магчымасці чалавека. Мы канкрэтна працуем над кожным чалавекам. Любога чалавека можна прывесці ў такі стан, калі ён будзе дакладна ведаць, што ён хоча, і будзе гэта рабіць. Калі чалавек вельмі хоча нешта рабіць, то ён будзе: калі ёсць унутраная гатоўнасць, то вы пераможаце. Грамадства трымаецца на пасіянарыях. І ў СМІ павінны прыходзіць працаваць такія асобы, асабліва таму, што журналістыка і СМІ — гэта перадача вы атрад дзяржавы. Па тым, якія СМІ, можна паставіць дыягназ любой дзяржаве.

Прэзідэнт Рускага клуба мастацтва і культуры мае асаблівы погляд на шмат якія рэчы. І на беларускую дзяржаву таксама. У Беларусь яна вельмі любіць прыязджаць — па покліку сэрца, як яна кажа, і таму, што адчувае сябе тут утульна. А ўсё таму, што культура ў Беларусі — асаблівая, яна так адчувае. І ў гэтым з ёй цяжка не пагадзіцца...

— Калі ў Беларусі захавалі культуру, то ў нас яна разбураецца. Ідзе поўнае размыванне культуры, асабліва праз тэлебачанне. А мы ў Рускім клубе мастацтва і культуры займаемся «адмываннем мазгоў»: імкнёмся вызваліць чалавека ад усяго павярхоўнага, таго, што спрыяе прымітывізацыі. Дарэчы, гэта тычыцца і СМІ: якую культуру мы даём людзям, такая яна і будзе.

Вось адчуваецца, што прыезд Наталі Галіцынай быў невыпадковы: яна шмат у чым параўноўвала Беларусь з Расіяй. І параўнанне, надзва, аказвалася на нашу карысць. А словы пра тое, як стаць пасіянарнымі асобамі, асабліва ўзрушылі аўдыторыю. Можа таму, што мы мала задумваемся, што ад нашых канкрэтна дзеянняў шмат што залежыць у свеце. Працаваць на родную культуру, на грамадства, несці пазітыўную энергетыку — хто ж супраць? Усе толькі «за»!..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ПУБЛІЧНАЯ МІСІЯ СМІ

**Учора, 23 чэрвеня, на Міжнародным медыяфоруме «Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне» ў Інстытуце журналістыкі БДУ на адной з прэс-лекцый выступіў прэзідэнт Еўрапейскага цэнтра геапалітычнага аналізу Матэўш Піскорскі. Тэма яго даклада — «Сучасная польская журналістыка: асноўныя тэндэнцыі і праблемы развіцця».**

Матэўш Піскорскі расказваў пра польскую сістэму СМІ. Сярод іншага ён закрануў такую з'яву ў польскай журналістыцы, як «Публічная місія». Гэтая місія замацавана заканадаўча і мае дачыненне да публічных (дзяржаўных) СМІ. Польскія дзяржаўныя тэле- і радыёканалы (нават дзяржаўных друкаваных СМІ ў Польшчы няма) павінны выконваць «місію», якая складаецца з асвятлення культуры, адукацыі, тэм меншасцяў і абавязковага распаведу аб дзейнасці дзяржаўных органаў. Акрамя таго, Матэўш быў уражаны беларускім тэлебачаннем: «У нас так шмат гістарычных перадач. У нас такога няма, бо ўсё камерцыялізавана. Паказваюць тое, што прыносіць прыбытак». Таму і існое ў Польшчы абавязковая «місія». Карэспандэнт «Звязды» запытаў, ці добра, што многія беларускія СМІ выконваюць сваю публічную місію на рускай мове? «Зразумела, што ў Беларусі існуе праблема з двухмоўем. Сапраўды, калі б, напрыклад, тэлеканалы пачалі выходзіць у эфір па-беларуску, то гэта станоўча адбілася б на выкаванні беларусаў. Аднак вам трэба пачынаць вырашаць гэтую праблему ўсё ж такі са школы», — лічыць прэзідэнт Еўрапейскага цэнтра геапалітычнага аналізу.

Можа, нашым міністэрствам таксама ёсць сэнс падумаць над канцэпцыяй сваёй «Публічнай місіі» для больш дзейснага захавання беларускай культуры?

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# Да праверкі тэставых работ курцы не дапускаюцца

**Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень будзе весціся з 27 па 30 чэрвеня.**

Да ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень будуць допушчаны толькі тыя абітурыенты, якія зарэгістраваліся да 1 чэрвеня, але прапусцілі тэсціраванне па ўважлівай прычыне. Парушальнікі правілаў ЦТ і абітурыенты, якія спазніліся на тэсціраванне без уважлівай прычыны, якую яны гатовы пацвердзіць дакументальна, перасдаць тэсціраванне ў рэзервовы дзень не змогуць, а значыць, і ўдзельнічаць у конкурсе на званне студэнта сёлета яны таксама не змогуць. Рэгістрацыя на тэсціраванне ў рэзервовы дзень будзе весціся ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П.В. Сухога, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовы дзень (4 ліпеня) прызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну вучэбную дысцыпліну.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў з задавальненнем адзначаюць, што колькасць абітурыентаў, якія рэгіструюцца, але прапускаюць цэнтралізаванае тэсціраванне, з кожным годам змяншаецца. Так, калі ў ранейшыя часы колькасць «прагульшчыкаў» даходзіла да 6-8 працэнтаў, то сёлета колькасць тых, хто ў дзень экзамену не дайшоў да пункта правядзення ЦТ, вагаецца ад 2 да 4 працэнтаў. Цікава, якая яўка будзе 4 ліпеня?

Як прызнаецца **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**, яны не могуць



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

знайсці тлумачэння адной тэндэнцыі, якая паўтараецца з года ў год. Чаму маладыя людзі, якім даводзіцца даказваць свае правы на ўдзел у тэсціраванні ў рэзервовы дзень з дакументамі ў руках, яго прапускаюць? Летась, напрыклад, такіх «прагульшчыкаў» набралася 135 чалавек, гэта значыць, што амаль 10 працэнтаў ад агульнай колькасці прайшоўшых паўторную рэгістрацыю на ЦТ не з'явіліся.

Сёння ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў кіпіць работа па апрацоўцы работ удзельнікаў ЦТ. Для сканавання бланкаў адказаў у інстытуце выкарыстоўваюцца шэсць высокахуткасных сканераў, якія дазваляюць за суткі апрацаваць 50 тысяч бланкаў. Гэтай хуткасці дастаткова, каб забяспечыць наступны этап работы — верыфікацыю, якая вымагае значна больш часу. Верыфікацыя робіцца выключна ў тых выпадках, калі ўзнікаюць сумненні ў правільнасці распазнавання сімвалаў. Рэч у тым, што нават самае сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтнай якасці пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8», калі яна напісана неакуратна. Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна прачытаць прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны яму з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках.

— Задача верыфікатараў — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках, але ўмяшацца ў працэс праверкі тэставых работ зададзеных апаратары не могуць, — тлумачыць Мікалай Фяськоў. — Яны толькі дапамагаюць камп'ютару ў распазнаванні сімвалаў, а свае знакі ўнесці не могуць, бо праграмнае забеспячэнне запамінае любое зробленае імі выпраўленне. Кожны верыфікатар працуе пад сваім паролем. Верыфікацыя праводзіцца тры разы рознымі людзьмі, і фактычна адзін кантралюе другога. Да таго ж ніхто з верыфікатараў не ведае, чыю работу ён правярае: пасля сканавання электронныя выявы вобласці рэгістрацыі і самі адказаў раздзяляюцца.

Работа па верыфікацыі патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены. А ўсяго на верыфікацыі задзейнічана каля 300 чалавек, пераважна дзяўчаты—студэнткі. У інстытуце пераканаліся, што дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы. Да прэтэндэнтаў на дадатковыя заробкі прад'яўляліся два асноўныя патрабаванні: яны не могуць удзельнічаць сёлета ў цэнтралізаваным тэсціраванні і не павінны курыць.

Зразумела, што для праверкі самых масавых дысцыплін — матэматыкі ці рускай мовы — патрабуецца больш часу, чым для праверкі работ удзельнікаў тэсціравання па геаграфіі ці гісторыі. Аднак ужо **27 чэрвеня арганізатары ЦТ абяцаюць абвесціць вынікі ЦТ па беларускай і рускай мовах, 28 чэрвеня — па гісторыі Беларусі, 29 чэрвеня — па матэматыцы, 30 чэрвеня — па грамадазнаўстве, 1 ліпеня — па хіміі, 2 ліпеня — па Сусветнай гісторыі найноўшага часу, 3 ліпеня — па фізіцы, 4 ліпеня — па біялогіі, 5 ліпеня — па замежнай мове і 6 ліпеня — па геаграфіі.** Хоць па вопыце мінулых гадоў можна спадзявацца, што Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў абвесціць вынікі ЦТ раней за вышэйназваныя тэрміны.

Інфармацыю аб выніках ЦТ можна будзе знайсці на сайце інстытута (**www.rikz.unibel.by**), на сайтах навучальных устаноў, дзе праходзіла тэсціраванне, на дошках для аб'яў ва ўстановах адукацыі, а таксама атрымаць на свой мабільны тэлефон. Для гэтага трэба будзе адправіць **SMS-запыт на кароткі нумар 5050**. Інтэрактыўны сэрвіс SMS-падпіскі даступны абанентам усіх аператараў сувязі GSM. Кошт адпраўкі SMS-запыту на нумар 5050 складае 3500 рублёў без уліку падатку (за гэтыя сродкі абітурыент атрымае вынікі па ўсіх трох прадметах). Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў планує апяратыўна, па меры апрацоўкі бланкаў адказаў, накіроўваць гэтую інфармацыю мабільным аператарам. Да таго ж аналагічным спосабам азнаёміцца з вынікамі тэсціравання па сваім тэлефоне можа любы абанент сотавай сувязі, які падтрымлівае абітурыента. Для гэтага яму неабходна адправіць такі ж запыт з пашпартнымі звесткамі чалавека, які ўдзельнічае ў тэсціраванні. Адправіць запыт можна як напярэдадні, так і пасля праходжання тэсціравання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Абзац

◢ ДТЗ адбылося 22 чэрвеня ў Аршанскім раёне ў цёмны час сутак. За рулём трохколавага мотаролера «Муравей» сядзеў 50-гадовы мужчына — інвалід 1-й групы (адсутнічаюць абедзве нагі і левая рука), які не меў правоў на кіраванне транспартам. Мужчына не справіўся з кіраваннем і з'ехаў у кювет, дзе перакуліўся. Ад атрыманых пашкоджанняў ён памёр на месцы.

**◢ У камеры захоўвання вакзала Мінск-Пасажырскі пры правядзенні камісійнага выймання рэчаў, у якіх скончыўся тэрмін захоўвання, у безгаспадарнай сумцы было выяўлена звыш 1 тыс. пачкаў цыгарэт айчыннай вытворчасці з акцызнымі маркамі Беларусі.**

◢ 22 чэрвеня ў Крычаве 25-гадовы кіроўца матацыкла «Хонда» наехаў на 44-гадовага веласіпедыста, які рухаўся ў спадарожным кірунку па пешаходнай дарожцы і раптам выехаў на дарожную частку. Веласіпедыст памёр на месцы ДТЗ.

**◢ У Брэсце позна ўвечар 22 чэрвеня 44-гадовы мясцовы жыхар, які ехаў за рулём «Рэно Сцэнік» сутыкнуўся з матацыклам «Хонда» пад кіраваннем 22-гадовага жыхара Брэсцкага раёна. Матацыкліст памёр на месцы. Верагодней за ўсё, трагедыя адбылася з-за таго, што машына не саступіла дарогу матацыклу.**

◢ У перыяд з кастрычніка 2009 па жнівень 2010 года былы начальнік цэха вытворчасці сухіх кармоў ААТ «Александрыйскае» (Шклоўскі раён) шляхам складання фіктыўных дакументаў пры вырабе поўных камбікармоў стварыў лішкі замяніка сухога малака, які ўваходзіць у іх склад. Таксама ў перыяд з ліпеня па жнівень 2010 года шляхам дачы ўказанняў падпарадкаваным па службе, якія не ведалі аб злачынстве, вырабіў няўлічаны камбікорм. Створанымі лішкамі сыравіны і прадукцыі начальнік незаконна завалодаў, вывез з тэрыторыі цэха і распарадзіўся на свой розум. Прычыненая шкода сельгаспрадпрыемству склала каля Br245 млн.

## Поўны абзац

**◢ Крымскія міліцыянеры забралі ў жыхароў Севастопаля белага каня, якога перафарбавалі ў зебру. Зараз гаспадарам каня, якія працавалі ў Камсамольскім парку і якія давалі турыстам і мясцовым жыхарам магчымасць пракаціцца на «незвычайнай» жывёле, пагражае штраф у памеры 38 тысяч грыўняў (больш $4000).**

◢ Дэпартамент папраўчых установ Нью-Ёрка ўвёў правілы вонкавага выгляду для наведнікаў, якія прыходзяць на спатканні са зняволенымі. З гэтага часу наведнікам, каб трапіць у памяшканне турмы, неабходна адзецца ў шырокую, мехаватую зялёную футболку. Адмысловa для гэтых мэтаў дэпартамент закупіў каля 750 футболак салатавага колеру памеру XXL. Новаўвядзенні накіраваныя на тое, каб падтрымліваць дружалюбную атмасферу ў папраўчай установе.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ЯК ВЕНЕРОЛАГ З АФТАЛЬМОЛАГАМ ДАМОВІЛІСЯ

**Матэрыялы крымінальных спраў у адносінах да двух светлагорскіх урачоў будуць перададзены ў суд у бліжэйшы час, — паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці. Як мы паведамлялі, 41-гадовы загадчык скурна-венералагічнага дыспансэра і 47-гадовая ўрач-афтальмолаг паліклінікі абвінавачваюцца ў сістэматычным атрыманні хабараў і службовай падробцы дакументаў. Мужчына, акрамя таго, — і ў падбухторванні да дачы хабараў.**

Урачоў супрацоўнікі УКДБ затрымалі ў пачатку сакавіка. Падчас следства ўстаноўлена, што грамадзяне за грошы выдавалі грамадзянам фіктыўныя лісткі непрацаздольнасці. «Бальнічныя» медыкі афармлялі і асабіста, і ўступіўшы ў змову. Напрыклад, венеролаг накіроўваў праінструктаваных пра суму і спосаб перадачы хабару «кліентаў» да афтальмолага. Кошт лістка непрацаздольнасці вар'іраваўся ад 100 да 400 тысяч беларускіх рублёў за пяць дзён — у залежнасці ад месца працы, дакладней, заробку «кліента». За плату «бальнічны» мог атрымаць грамадзянін, які не стаіць на дыспансэрным уліку ў Светлагорскай ЦРБ і нават не пражывае ў Светлагорску. Часта ўрач наогул не бачыў свайго «пацыента»: выдаваў «бальнічны» праз пасрэдніка.

За падробку, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, арышту, абмежавання волі на тэрмін да пяці гадоў ці пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў — калі злачынства было здзейснена паўторна або групай асоб па папярэдняй змове.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## КАНТРАБАНДНАЕ ПАЛІВА ВЕЗЛІ ІНШАЗЕМЦЫ

**Супрацоўнікі Віцебскай мытні на пагранічным пункце пропуску «Урбаны» затрымалі адразу тры грузавікі, якія накіроўваліся з Беларусі ў Латвію. Машынамі кіравалі грамадзяне Польшчы і Літвы. Яны, як высветлілася, спрабавалі незаконна вывезці паліва звыш устаноўленых нормаў.**

Паводле інфармацыі Віцебскай мытні, пры правядзенні даглядаў у трох аўто знайшлі ажно звыш 3,2 тысячы літраў дызельнага паліва. Каністры з палівам схавалі нават пад казырком на даху кабіны, а таксама павялічылі аб'ёмы дадатковых бакаў аўто больш чым на 2000 літраў. Заканадаўствам за выяўленае парушэнне прадугледжаны штраф у памеры да пяцідзесяці базавых велічынь з канфіскацыяй транспартнага сродку і паліва або без канфіскацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НЯМА ЎПРАВЫ?

**У гаражным кааператыве па вул. Наканечнікава, што ў Баранавічах, супрацоўнікі міліцыі затрымалі мікрааўтобус «Фальксваген-Транспарцёр», у якім жыхар горада перавозіў 400 літраў спірту.**

За апошнія два гады гэта ўжо 4 затрыманне 40-гадовага мужчыны, і за гэты перыяд у яго канфіскавалі 6850 літраў спірту на суму 68,5 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.06.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ........ 4 973,00 | 1 чэшская крона ........ 291,83 | USD ........ 28,0568 |
| ▲ 1 еўра ........ 7 099,45 | 1 польскі злоты ........ 1779,54 | 10 UAH ........ 35,1149 |
| 1 латвійскі лат ........ 10 010,06 | ▼ 1 расійскі рубель ........ 177,25 | 1000 BYR ........ 56,5775 |
| 1 літоўскі літ ........ 2 055,47 | украінская грыўня ........ 622,25 | EUR ........ 40,0791 |

ЗВЯЗДА 24 чэрвеня 2011 г.

# ВЫХАВАННЕ ДЗЕТНАСЦІ

## Калі памкненне да сям'і ў сучаснай моладзі няма, яго варта прывіць?

**ЗАМОРСКІЯ павевы накшталт «чайлд фры» (г.зн. вольныя ад дзяцей — і размова не пра людзей, якія ўсімі вядомымі метадамі лечацца ад бясплоднасці, а пра тых, хто добраахвотна адмаўляецца ад прадаўжэння роду) знаходзяць сваіх прыхільнікаў і ў нашай краіне. Сучасныя пары не спяшаюцца штампаваць пашпарты і тым больш абзаводзіцца нашчадкамі. Атрымліваюць асалоду ад працэсу, а не ад выніку, так бы мовіць.**

Дзяржава ж ад гэтага атрымлівае галаўны боль: насельніцтва не ўзнаўляецца, старэе, і выдаткі на людзей, якія не забяспечылі сябе жывой «пенсіяй», растуць. Занепакоеныя і заканадаўцы — як павярнуць свядомасць маладых людзей у бок сям'і, заахвоціць да нараджэння дзяцей? У парламенцкай камісіі, адказнай за адукацыю, дэпутаты мяркуюць, што гэтаму можна навучыць. Абмеркаванню яны прысвяцілі асобнае пасяджэнне.

— У Беларусі вялікая ўвага надаецца падтрымцы сем'яў, вылучаюцца велізарныя сродкі на будаўніцтва жылля, забеспячэнне дзіцячым харчаваннем, выплату дапамог. Але ж чаканага эфекту ад гэтай дапамогі пакуль няма, — заўважае **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ**.

У пацвярджэнне сваіх слоў ён прыводзіць канкрэтныя факты. Нізкая нараджальнасць, шмат грамадзянскіх шлюбаў, многія ж зарэгістраваныя шлюбы заканчваюцца разводам.

— За студзень—красавік 2011 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць зарэгістраваных шлюбаў зменшылася на адзін адсотак, а колькасць разводаў павялічылася на 11 з хвосцікам, — дзеліцца бязрадаснай статыстыкай дэпутат. — За той жа перыяд на тысячу шлюбаў, зарэгістраваных летась, прыпадала 566 разводаў, сёлета — 635.

Прычыну ўсіх згаданых негатыўных тэндэнцый парламентарый бачыць не ў матэрыяльным, а ў ментальным.

— Мы бачым, што ўхіл толькі на матэрыяльную падтрымку сем'яў не дае належнага эфекту, таму што праз 2-3 гады людзі прызвычайваюцца да гэтай падтрымкі і патрабуюць яшчэ большага. Атрымліваецца, мы плацім за тое, каб нараджалі дзяцей? Гэта няправільна. Кажуць, цяпер цяжка выхаваць шмат дзяцей. Але давайце паглядзім, хіба раней было ў гаспадыні столькі падтрымкі, колькі ёсць зараз — і пральныя машыны, і халадзільнікі, і мікрахвалёўкі. Тут, відаць, справа не ў матэрыяльным. Тут упіраецца ўсё ў тое, што не гатовыя людзі да стварэння сям'і, баяцца браць на сябе гэтую адказнасць.

І вось тут заканадаўцы бачаць поле для адукацыйнай дзейнасці. Маўляў, навучаць трэба будучых бацькоў.

— Неабходна расказваць, тлумачыць, пераконваць людзей у тым, што сям'я — гэта найвялікшая каштоўнасць. І гэта задача ўсяго грамадства, у тым ліку і сістэмы адукацыі. Пачынаць трэба з самых малых гадоў — рыхтаваць чалавека да ўсведамлення таго, што сям'я гэта бяспека. Не толькі дэмаграфічная, гэта нацыянальная бяспека краіны.

Падобныя арыенціры знайшлі адлюстраванне і ў Кодэксе аб адукацыі, над якім працуюць у камісіі.

— Намі была асобна вылучана задача фарміравання культуры сямейных адносінаў, а да яе складнікаў былі аднесены гендарнае і сямейнае выхаванне, — расказвае Уладзімір Здановіч. — Найважнейшым заканадаўчым рашэннем стала ўключэнне ў Кодэкс нормаў аб кампетэнцыях бацькоў. Яны становяцца цяпер паўнапраўнымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу і абавязаныя па законе забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця вучня.

Адукацыйны працэс будзе будавацца на аснове традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа, акцэнтуе дэпутат, а найважнейшай каштоўнасцю заўжды была сям'я. Яна ўзнікла задоўга да дзяржавы, царквы і любых грамадскіх інстытутаў. І павінна быць вечнай каштоўнасцю, якая ніколі не выходзіць з моды.

Прывіваць сямейныя каштоўнасці ў навучальных установах дапамогуць спецыяльныя праграмы. І такія ўжо ёсць у некаторых ВНУ, пакуль у якасці эксперымента. Вопытам падзялілася з парламентарыямі **Алена ВУСЦІНЕНКА, дырэктар Цэнтра перспектыўнага дзяцінства БДУ**. Яна распавяла пра школу ўсвядомленага бацькоўства — праект, які ладзіўся на працягу двух гадоў у чатырох ВНУ пры падтрымцы дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ. Сёлета ў маі навучанне скончыла першая сотня выпускнікоў такой пакуль яшчэ нязвыклай для нашай краіны школы.

Дэпутатаў цікавіў чыста практычны аспект: «Вынік у выглядзе пакета дакументаў Беларусі не патрэбны, нам патрэбнае павелічэнне колькасці дзяцей», — падкрэсліў Уладзімір Здановіч.

— Калі толькі даведнікі ды лекцыі, то гэта абсалютна неэфектыўна будзе, патрэбна нешта відовішчнае, — упэўнены **дэпутат Аляксандр ШАЦЬКО**.

Ён лічыць неабходным, каб падобныя адукацыйныя праграмы сталі абавязковым курсам у школах. Парламентарый таксама згадаў, што праграм па дэмаграфіі ў краіне шмат, і для таго, каб яны былі плённымі, неабходная дакладная каардынацыя. Яго пазіцыю падзяляе **дэпутат Святлана ШЫЛАВА**. Яна выразіла цвёрдае перакананне, што над падобнымі праектамі працаваць трэба комплексна — розным спецыялістам і ведамствам: і педагогам, і медыкам, і іншым. **Дэпутат Галіна ЮРГЯЛЕВІЧ** таксама акцэнтавала неабходнасць актыўнага ўдзелу соцыуму, грамадскіх інстытутаў, у іншым выпадку, на яе думку, праекты будуць недасканалымі.

Па выніках абмеркавання камісіяй было вырашана рэкамендаваць Міністэрству адукацыі прааналізаваць магчымасць распаўсюджвання падобных праграм у навучальных установах. Парламентарыі таксама лічаць неабходным больш шырока выкарыстоўваць магчымасці мас-медыя ў папулярызацыі сямейных каштоўнасцяў. Верагодна, што агучаныя прапановы знойдуць адлюстраванне не толькі ў выглядзе рэкамендацый ведамствам, але і паспрыяюць заканадаўчым зменам.

**Заклікаць да душы, а не да кашалька, яно, можа, і слушна. Але ж дзяцей, якія так патрэбны дзяржаве, трэба нечым карміць, пагадзіцеся. Мая сяброўка, якая нядаўна нарадзіла двайнят, атрымлівае на іх 600 тысяч дапамогі, а на адны толькі малочныя сумесі ідзе мільён. Дык можа, справа не ў тым, што матэрыяльны стымул не працуе, а ў тым, што ён недастатковы? І справа не толькі і не столькі ў дапамогах, колькі ва ўзроўнях прыбыткаў і трат.**

**Ала МАЧАЛАВА.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов** | **Аукцион состоится 27 июля 2011 г., в 11.00, по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45<br>КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»** | | | | |
| 2 | **Срок приема документов** | с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 21 июля 2011 года | | | | |
| 3 | **Номер лота** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 4 | **Адрес земельного участка** | Жлобинский район, Пиревичский с/с, д. Салтановка, ул. Вокзальная (в районе ж/д вокзала) | Жлобинский район, г. Жлобин, микрорайон 1, 21/1 | Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Козлова, 2Г | Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Козлова, 2Д | Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Промышленная, 19/1 |
| 5 | **Кадастровый номер участка** | 321884805101000119 | 321850100002003214 | 321850100001001626 | 321850100001001625 | 321850100001001624 |
| 6 | **Площадь, га** | 0,1091 | 0,0120 | 0,6545 | 0,7616 | 0,0050 |
| 7 | **Целевое назначение** | Для строительства объекта торговли | Для размещения объектов розничной торговли (торговый павильон по продаже промышленных товаров) | Для размещения объектов административно-торгового, складского назначения | Для строительства и обслуживания станции технического обслуживания автомобилей | Для установки остановочного комплекса |
| 8 | **Срок аренды** | 10 (десять) лет | 10 (десять) лет | 20 (двадцать) лет | 25 (двадцать пять) лет | 10 (десять) лет |
| 9 | **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия** | Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ) | | | | |
| 10 | **Условия и ограничения** | 1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка.<br>2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка.<br>3. Заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.<br>4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год.<br>5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.<br>6. Произвести благоустройство прилегающей территории (Лот № 3, Лот № 4, Лот № 5). | | | | |
| | | 7. 0,0299 га – охранная зона линии электропередачи с напряжением 10 кВ | | | | 7. Площадь остановочного навеса должна быть не менее площади торгового павильона |
| 11 | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД. | | | | |
| 12 | **Начальная стоимость, рублей** | 77 143 | 1 860 665 | 26 277 945 | 35 939 045 | 582 884 |
| 13 | **Сумма задатка, рублей** | 5 000 | 100 000 | 2 000 000 | 3 000 000 | 50 000 |
| 14 | **Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей** | 1 518 058 | 2 119 940 | 1 652 812 | 1 784 154 | 1 495 671 |
| 15 | **Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей** | 1 000 000 | 1 000 000 | 1 000 | 1 000 000 | 1 000 000 |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

3. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление об участии в нем подано только одним гражданином, индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом, местный исполнительный комитет при наличии согласия соответствующего из указанных лиц в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении этому лицу земельного участка в аренду. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо обязаны внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) в размере его начальной цены, увеличенной на 5 процентов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона. После совершения лицом названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет заключает с ним договор аренды земельного участка.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) не позднее 21 июля 2011 года подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

## У Мінску пры капрамонце жылых дамоў з панэльнай сістэмай ацяплення батарэі будуць выносіць са сцен у памяшканні

**Жылыя будынкі з панэльнай сістэмай ацяплення лічацца энергарасходнымі і маюць патрэбу ва ўцяпленні.**

Акрамя таго, у такіх дамах тэхнічна немагчыма наладзіць пакватэрны ўлік цяпла, пры якім размеркавальнікі цеплаэнергіі манціруюць да радыятараў. Прынята рашэнне пры капітальным рамонце і цеплавой мадэрнізацыі дамоў з панэльным ацяпленнем выносіць радыятары са сцен у памяшканні.

## Мінчане, якія адмаўляюцца ад праверкі лічыльнікаў вады, могуць быць пераведзены на аплату па норме расходавання вады

**У сталіцы выяўляюцца выпадкі не правераных у вызначаныя тэрміны індывідуальных прыбораў уліку расходу вады.**

— Прычыны бываюць розныя, — адзначыў у гутарцы начальнік цэнтра разліку са спажыўцамі «Вадазбыт» УП «Мінскводаканал» Віталь ГАПАНОВІЧ. — Хтосьці свядома адмовіўся, маўляў, вадамеры працуюць нармальна; іншыя не знайшлі часу ці адсутнічалі дома ў перыяд праявядзення планавай праверкі. Такія абаненты ўсё роўна павінны выканаць гэтую працэдуру. У адваротным выпадку лічыльнікі могуць быць зняты з камерцыйнага ўліку і абслугоўвання, а іх уладальнікаў пераведуць на поўную аплату.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ**, *«Мінск—Навіны»*.

## За ноч укралі дзве машыны

**Жыхар Полацка ў суседнім Наваполацку за ноч умудрыўся ўкрасці па чарзе два легкавыя аўтамабілі. Было гэта ў ноч з 21-га на 22-га чэрвеня.**

Спачатку ў наваполацкі гарадскі аддзел унутраных спраў па знікненне сваёй старой «Мазды» паведаміў студэнт. Падчас рэалізацыі аперацыі «Пошук» машына была затрымана ля Наваполацка. Потым высветлілася, што гэты ж чалавек (а ім аказаўся 19-гадовы беспрацоўны) каля адзінаццаці гадзін ночы 21-га чэрвеня аналагічным чынам украў «Жыгулі» шостай мадэлі, якая належыць яшчэ аднаму жыхару Наваполацка. Прычым у баку быў усяго толькі літр бензіну, таму злодзей далёка ад'ехаць не мог. Гэтае аўто, як і першае, у тэхнічна спраўным стане знайшлі паміж Полацкам і Наваполацкам. Машыны вярнулі ўладальнікам. Міліцыянеры параілі ім абавязкова ўстанавіць сігналізацыю, бо аўто не былі ёй абсталяваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Пяць ліхтароў і адзін сабака

**У міліцыю звярнуліся адразу дзве жыхаркі дамоў па вуліцы Міру ў Пружанах.**

Бо ноччу з падворкаў скралі ў адной пяць ліхтароў, а ў другой — тры ліхтары асвятлення і дэкаратыўнага сабаку. Заведзена крымінальная справа.

**Яна СВЕТАВА.**

04 июля 2011 в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО "Полесьежилстрой"

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда общества.
2. О внесении и утверждении изменений и дополнений в устав общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.

Начало регистрации участников собрания: 14.30.

*УНП 200050191*

Згублены **студэнцкі білет № 06Д0561/08** на імя **Волкава Міхаіла Уладзіміравіча**, выдадзены Інстытутам сучасных ведаў, лічыць **несапраўдным**.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Классика индустрии моды», находящегося по адресу: Городокский район, д. Смоловка:

| № п.п. | Наименование объекта оценки | Стоимость с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 201/С-10550, наименование – спальный корпус, общей площадью 166,6 кв.м | 15 903 000 руб. |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 201/С-10552, наименование – бильярдная, общей площадью 44,6 кв.м | 5 688 600 руб. |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 201/С-10551, наименование – баня, общей площадью 47 кв.м | 4 753 800 руб. |

**Время проведения торгов — 19 июля 2011 года, в 11.00, по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 323.**

Минимальная величина первого шага торгов 5% от первоначальной стоимости имущества.

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: внести на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале АСБ «Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНН 300007670 сумму в размере 10% от стоимости продаваемого имущества, подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение 5 рабочих дней после окончания торгов.

Победитель аукциона обязан возместить затраты суда на организацию и проведение аукциона.

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области по адресу: 210025, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 321 или по телефонам тел./факс. (8 0212) 49 13 22, тел. 49 13 44, тел.м. +37544 757 63 00 судебный исполнитель Новолоцкий Виктор Валерьевич или тел. 49 13 40 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович. Дополнительная информация на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by, e-mail: vitsud@tut.by.**

Наблюдательный совет открытого акционерного общества

**«ДСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ»**

сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 30 июня 2011 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж (конференц-зал).

**Повестка дня:**

**1.** Об увеличении Уставного фонда ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель».
**2.** О внесении изменений в Устав общества.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

*УНН 400022426*

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, принадлежащего ЧТУП «Природа-СервисГрупп», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Московский, 57а:

| № п/п | Наименование имущества | Рыночная стоимость, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|
| 1 | Токарный станок | 9 884 800 |
| 2 | Станок станкостроительного завода № 8729 7Г35 | 7 725 120 |
| 3 | Фрезерный станок, модель 6Р82 № 2896, 1974 г.в. | 13 464 800 |
| 4 | Станок сверлильный 2А135 № 9629 | 3 447 360 |
| 5 | Кузьнечно-пресовая установка № 765 | 250 400 |
| 6 | Пресс гидравлический 1671М | 6 591 200 |

**Время проведения торгов — 15 июля 2011 года, в 11.00, в г. Витебске, ул. Правды, 32, каб. 323.**

Минимальная величина первого шага торгов 5% от первоначальной стоимости имущества.

Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: внести на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале АСБ «Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНН 300007670 сумму в размере 10% от стоимости продаваемого имущества, подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение 5 рабочих дней после окончания торгов.

Победитель аукциона обязан возместить затраты суда на организацию и проведение аукциона.

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области по адресу: 210025, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 321 или по телефонам тел/факс. (8 0212) 49 13 22, тел. 49 13 44, тел.м. +37544 757 63 00 судебный исполнитель Новолоцкий Виктор Валерьевич или тел. 49 13 40 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович. Дополнительная информация на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by, e-mail: vitsud@tut.by.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **формы 1СУ серии КВ № 1762361** считать **недействительным**.

*УНП 101883943*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С ПРИМЕНЕНИЕМ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Аукцион состоится 28 июля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 311185, 229022, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8(0225)474940; по лоту № 2 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, тел. 8(0222)226357.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 № 1049.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **26 июля 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона **28 июля 2011 г.** с 10.00 до 10.50. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявлений на участие в аукционе включительно.

| № лота | Сведения о предметах аукциона | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | | Информация о земельных участках | | | 
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Цена имущества, тыс. руб. | | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. |
| | | | начальная | минимальная | | | |
| 1 | Находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у ОАО «Бобруйский машиностроительный завод» капитальные строения бывшего подсобного хозяйства и строительные материалы | Могилевская обл., Бобруйский район, Вишневский сельсовет, дер. Пересово | 89 837,576 | 20 302,976 | 3,5 | 99 | 15 792,0 |
| | Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота: здание насосной станции одноэтажное, кирпичное, 14,13 кв.м с водонапорной башней металлической и скважиной глубиной 52 м, здание склада для ульев одноэтажное, бревенчатое, 75,95 кв.м, здания персонала № 1 и 2 одноэтажные, кирпичные, 84,1 и 81,18 кв.м, здание зернотока одноэтажное, 250,26 кв.м, стены – волнистый шифер с воротами специальными металлическими 13 кв.м – 2 шт., здание коровника с пристройкой одноэтажное, 716,03 кв.м, стены – крупные блоки с добавлением кирпича, здание конюшни одноэтажное, деревянное частично разрушенное, 79,24 кв.м; строительные материалы | | | | | | |
| | **Начальная цена предмета аукциона 105 629,576 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 36 094,976 тыс. руб.** | | | | | | |
| 2 | Административное здание одноэтажное, шлакобетонное, 139,7 кв.м, гараж панельный, 67,5 кв.м | Могилевская обл., г.п. Краснополье, ул. Зевина, д. 39 | 38 552,922 | 7 710,585 | 0,1591 | 50 | 9 838,698 |
| | **Начальная цена предмета аукциона 48 391,62 тыс. руб. Минимальная цена предмета аукциона 17 549,283 тыс. руб.** | | | | | | |

Условия для победителей аукциона в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества: получение в установленном порядке разрешения Бобруйского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Земельный участок, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, расположен в водоохранной зоне реки Березина, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод. С перечнем ограничений в использовании указанного земельного участка можно ознакомиться у организатора аукциона.

**Задаток в сумме 5 000,0 тыс. белорусских рублей** перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, а также копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами в белорусских рублях по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

# КАРМЯНСКІ КАЎКАЗ


Каўказец Віктар Іванавіч КРАСІКАЎ і месца ягонай працы.


Колішняя вуліца Каўказа.

Каўказ пазначаны толькі на карце.




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вёска Каўказ існуе нібы віртуальна. Лічыцца былой, хоць шмат дамоў захавалася, быццам музейныя экспанаты. Ні шыльдаў, ні дарожных паказальнікаў да яе няма. А ў аўтамабільным атласе, які набыў летась, гэты населены пункт якраз пазначаны. Таму і рызыкнуў зазірнуць у гомельскую глыбінку. Як аказалася, недарэмна. Першы стрэчны — 30-гадовы Андрэй Цітоў — распавёў сваю версію паходжання назвы Каўказ:

«Вакол вёскі ўтварыліся глыбокія равы, і калі стаяць на абрыве, наступае адчуванне, быццам знаходзішся на вяршыні гары. Вось і Каўказскія горы».

Чатыры гады запар Цітоў спрабуе сябе ў ролі фермера па гародніне. Бывае тут наездамі. Ягоны родны брат жыў стала, але не вытрымаў і з'ехаў. Разам займаліся агуркамі і памідорамі, зладзілі парнік. Але сёлета ў адзіночку Андрэй не рызыкнуў укладваць грошы ў расаду і поліэтыленавую плёнку і адвёў пад культуры невялікі кавалак зямлі. Увесь ягоны клопат цяпер пра мёд. У Жыліцкім сельскагаспадарчым каледжы, дзе ён вучыўся на агранома, наведваў курсы па пчалярскай справе, і гэта яму аказалася дарэчы.

Пасля Цітова іду наведваць адзінага сталага жыхара па мянушцы «залатыя рукі». Па колькасці драўляных скрынак і прыборных лямпавых дошках ад тэлевізараў, кінутых на падворку, адчуваеш, што гаспадар — спец па радыётэхніцы.

«Раней я рамантаваў і тэлевізары, і халадзільнікі, і гадзіннікі, — кажа 71-гадовы Віктар Красікаў. — А «залатымі рукамі» мяне клічуць даўно і заўсёды».

Жывучы каля дзесяці гадоў у пакінутай людзьмі вёсцы, Віктар застаецца карысны сабе і людзям: робіць аглоблі, круціць вяроўкі і шые рукавіцы.

— З дзяцінства дапамагаў маці шыць, калі жылі ў недалёкай адсюль Праўдзе. Вось і ўмею ўсё.

Я не стаў выпытваць, чаму Віктар Іванавіч жыве адзін і наогул, што падштурхнула яго стаць жыхаром ціхага і бязлюднага Каўказа. На развітанне ён сказаў, што хоча зімою з'ехаць адсюль. Напэўна, у пошуках свайго лёсу.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Кармянскі раён.*

**Рэдакцыя атрымала адказ**

## ЗА ЗМЕСТ ВІДЭАТРАНСЛЯЦЫІ АДКАЗНЫЯ ІДЭОЛАГІ ЧЫГУНКІ

**28 мая гэтага года ў газеце быў надрукаваны матэрыял «З чаго складаецца фірмовасць?», дзе гаворка ішла пра абавязковую трансляцыю ў фірменным цягніку «Буг» кінафільмаў незалежна ад жадання пасажыраў.**

У лісце, які падпісаў першы намеснік начальніка Беларускай чыгункі В.М. ЛАПЦІНСКІ, гаворыцца: «...З ліпеня 2002 года цягніку №105\106 Брэст—Мінск «Буг» прысвоена катэгорыя «фірменны». Улічваючы тое, што цягнік ідзе днём, ён сфарміраваны пераважна з вагонаў адкрытага тыпу (сядзячых), у якіх для стварэння камфортных умоў салоны абсталяваны сістэмамі відэатрансляцыі.

Вяшчанне цягніковай радыёкропкі ўвахозіць у пералік стандартных паслуг, якія прадастаўляюцца пасажырам на працягу паездкі і павінны ажыццяўляцца ў перыяд з 8 да 23 гадзін. Па радыётрансляцыйнай сетцы перадаецца службовая інфармацыя аб правілах праезду, захаванні пасажырамі мер супрацьпажарнай бяспекі, аб паслугах, якія могуць быць аказаны пасажырам, інфармацыя прафілактычнай накіраванасці. Таксама перадаюцца музычныя праграмы.

Трэба зазначыць, што мастацкаму і маральнаму ўзроўню прадукцыі, якая прапануецца да дэманстрацыі ў пасажырскіх цягніках, надаецца асаблівая ўвага. Ажыццяўляецца пастаянны кантроль за набыццём і дэманстрацыяй відэапрадукцыі. За гэтую працу адказваюць намеснікі начальнікаў участкаў фарміравання пасажырскіх цягнікоў, якія вядуць пытанні ідэалагічнай работы і кадраў.

Вынікі апошняга апытання пасажыраў фірменнага цягніка «Буг» паказалі, што больш за 86% рэспандэнтаў падтрымліваюць ажыццяўленне дэманстрацыі відэафільмаў, больш за 60% з іх задаволены тэматыкай і зместам відэа.

Разам з тым з улікам заўваг, змешчаных у артыкуле, кіраўніцтву прадпрыемства фарміравання цягніка дадзена заданне перагледзець графік работы цягніковай радыёкропкі і трансляцыі відэапраграм. Указана таксама на больш уважлівае стаўленне з боку брыгады да патрэб пасажыраў на працягу паездкі. Пры неабходнасці праваднікі павінны рэгуляваць як размяшчэнне пасажыраў, так і сілу гуку відэа- і радыёперадач.

Выказваем падзяку газеце за ўвагу да чыгункі і пастаноўку праблемных пытанняў, што дапамагае нам прымаць правільныя рашэнні».

**Факт**

### У МІЛІЦЫЯНЕРАЎ СКРАЛІ ГРОШЫ

**Бухгалтарка раённага аддзела ўнутраных спраў аднаго з раёнаў Віцебшчыны зарабляла на адпускных міліцыянераў.**

Пракурор Віцебскай Вобласці Генадзь Дыско прасіў пакуль што ў інтарэсах следства не ўказваць раён. Як ён растлумачыў «Звяздзе», ужо вядома, што бухгалтарка складвала заведама лжывыя плацежныя даручэнні і гэтак далей да адпускных дакументаў супрацоўнікаў. Калі работнікі сыходзяць у водпускі, зразумела, ім налічваюцца адпаведныя сумы. Чым бухгалтар і скарысталася на сваю карысць. У выніку было незаконна атрымана больш за 6 мільёнаў рублёў.

### МІЛІЦЫЯНЕР ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ЗЛОЎЖЫВАННЯХ

**Спіс «гучных спраў», узбуджаных у дачыненні да віцебскіх міліцыянераў, якія фальсіфікавалі доказы па фактах незаконнага абароту наркотыкаў, папоўніўся.**

Як расказаў «Звяздзе» пракурор Віцебскай вобласці Генадзь Дыско, за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі адказвае перад законам яшчэ адзін работнік міліцыі. Раней два былі асуджаны. Гэты таксама падазраецца ў тым, што яшчэ ў 2003 годзе ім былі фальсіфікаваныя доказы па факце незаконнага абароту наркотыкаў. І пра гэта стала вядома толькі сёлета. Узбуджана крымінальная справа. Падазронага супрацоўніка міліцыі арыштавалі і вядзецца следства.

Чалавек адсядзеў пяць гадоў з-за мяркуемага «перагібу» пры ўзбуджэнні крымінальнай справы, расследаванні... Як падкрэсліў пракурор вобласці, тая крымінальная справа — 2003 года, узбуджаная, разглядаецца па-новай. Ужываючаму наркотыкі ўмяняліся ў віну ўсе тры часці адпаведнага артыкула Крымінальнага Кодэкса, таму і асудзілі, так бы мовіць, па-поўнай. Цяпер у пракуратуры разбіраюцца, ці заслужанае пакаранне атрымаў грамадзянін.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СЛУЖБОВАЕ ЖЫЛЛЁ

**ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ**




(8 017) 287 19 68

***Я працую ўжо звыш 17 гадоў у дзяржаўнай арганізацыі, жыву з сям'ёю ў выдзеленым мне службовым памяшканні. Хацеў бы даведацца, ці выселяць мяне, калі я памяню месца працы.***

**Алег,** *Віцебская вобласць*

Пытанні, што датычацца службовых жылых памяшканняў, рэгламентуецца Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь (артыкулы 91 — 96), главой 4 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 29.11.2005 г. № 565, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19.03.2007 г. № 128 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення і выкарыстання жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду», іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Згодна з Жыллёвым кодэксам і Палажэннем, зацверджаным Указам № 565, службовыя жылыя памяшканні прадастаўляюцца грамадзянам у сувязі з характарам іх працоўных (службовых) адносін. Службовыя жылыя памяшканні не падлягаюць прыватызацыі, абмену, раздзелу і здачы па дагаворы паднайму, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Заселеныя службовыя жылыя памяшканні не падлягаюць выключэнню са складу службовых, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацам 5 падпункта 1.1 Указа № 565, у прыватнасці, калі яны па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь перадаюцца ва ўласнасць грамадзян.

Указам № 128, названым вышэй, была прадугледжана магчымасць перадачы на платнай аснове ва ўласнасць некаторых катэгорый грамадзян службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, атрыманых імі да 8 красавіка 2006 года, калі яны да 1 студзеня 2008 года звярнуліся з пісьмовай заявай аб гэтым у арганізацыю, на балансе якой знаходзіцца гэта жыллё.

Так, калі вы атрымалі службовае жыллё да 8.04.2006 г. і стаялі на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то вы мелі права да 1.01.2008 г. падаць заяву на перадачу вам ва ўласнасць гэтай кватэры на платнай аснове.

Аднак гэта можна будзе зрабіць і цяпер. 22 красавіка 2011 года Прэзідэнт падпісаў Указ № 172, які ўступіць у дзеянне 1 ліпеня. Указам здымаецца абмежаванне тэрміну звароту грамадзян за перадачай ва ўласнасць службовага жылля, якое яны атрымалі да 8.04.2006 г., пры наяўнасці іншых падстаў. У вашым выпадку гэта адно — на дату падачы такой заявы вы павінны быць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а неабходны стаж работы ў арганізацыі ў вас ёсць.

Указам прадугледжваецца магчымасць аплаты кошту службовых жылых памяшканняў у растэрміноўку на 20 гадоў пры ўмове ўнясення першапачатковага ўзносу ў памеры не менш 10 працэнтаў іх кошту.

У якасці даведкі. Асобы, якія пражываюць у службовых жылых памяшканнях і не маюць ва ўласнасці іншага жылога памяшкання ў населеным пункце па месцы прыняцця іх на ўлік агульнай плошчай 15 кв. метраў і болей на аднаго чалавека, прымаюцца на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жылых умоў (падпункт 3.1.6 пункта 3 Палажэння, зацверджанага Указам № 565).

У выпадку спынення работнікам, які пражывае ў службовым жылым памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду, працоўных адносін з арганізацыяй, на балансе якой знаходзіцца гэтае памяшканне, яны падлягаюць высяленню з яго з усімі грамадзянамі, што пражываюць з ім, у адпаведнасці з заканадаўствам у судовым парадку (артыкул 96 Жыллёвага кодэкса, п. 77 Палажэння, зацверджанага Указам № 565).

Артыкулам 96 дзейнага Жыллёвага кодэкса для асобных катэгорый грамадзян прадугледжана, што іх высяленне са службовага жылога памяшкання немагчыма без прадастаўлення іншага жылога памяшкання. Так, напрыклад, гэта грамадзяне, якія адпрацавалі ў арганізацыі, што прадставіла ім службовае жыллё, не менш 10 гадоў або якія маюць права на працоўную пенсію па ўзросце (у тым ліку на льготных умовах), а таксама за выслугу гадоў і іншыя.

Праект новага Жыллёвага кодэкса, прынятага якога чакаецца восенню, не прадугледжвае такіх гарантый для работнікаў, што спынілі працоўныя адносіны з арганізацыяй, на балансе якой знаходзіцца займаемае імі службовае памяшканне (артыкулы 92, 125 — 127 праекта Жыллёвага кодэкса).

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже единым лотом имущества, принадлежащего ООО «Стройкровля», расположенного по адресу: г. Брест, ул. Л-та Рябцева, 44.**
**В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование и характеристики продаваемого имущества |
|---|---|
| 1 | Капитальное строение – хранилище (инв. № 100/С-1683). Общая площадь – 645,4 м². |
| 2 | Покрытие асфальтобетонное, 356,5 м² |
| 3 | Покрытие асфальтобетонное, 42 м² |
| 4 | Покрытие гравийное, 965 м² |
| 5 | Забор ж/б панели, 162 м² |
| 6 | Забор металлический, 216 м² |
| 7 | Ворота въездные, 14 м² |

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке 3248 м². Кадастровый номер 140100000001021551.

Начальная цена – 294 365 000 белорусских рублей без учета НДС.

Аукцион состоится в **12.00 15 июля 2011 г.** по адресу: г. Брест, ул. Л-та Рябцева, 29А, оф. 203.

Продавец имущества – ООО «Стройкровля». Организатор аукциона – управляющий ООО «Стройкровля» Бахуревич Е. В., тел. (8 029) 3608384.

Заявление на участие в аукционе принимаются организатором аукциона по **14 июля 2011 г.** по адресу: г. Гродно-25, а/я 13.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества должен быть зачислен на расчетный счет ООО «Стройкровля» 3012016500010 в ОАО «БПС-Банк», филиал по Гродненской области, код 335, УНП 590001553.

Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов стоимости реализуемого с аукциона имущества. Победителем признается участник, предложивший наивысшую цену. С победителем аукциона в течение 7 календарных дней заключается договор купли-продажи недвижимого имущества.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в срок, указанный в договоре купли-продажи, по согласованию с продавцом.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

# ГАРУЧАЕ, ЦЫГАРЭТЫ І... АКАРДЭОН

Натура

**У памежную з Гроднам Кузніцу ўпершыню ездзіў цягніком гадоў пятнаццаць таму, і вось, пасля даволі працяглага перапынку — чарговая нагода. Цікава, каго цяпер перавозіць гэты транспартны сродак, які ўжо, так бы мовіць, гістарычна атаясамліваўся ў асноўным са спіртным і цыгарэтамі ў польскім кірунку і з таварамі яўна не толькі для ўласнага карыстання — у зваротным. Вось на якія карцінкі з натуры аўтар гэтых радкоў звярнуў увагу незадоўга да ўводу абмежавальных мер на вываз з Беларусі тых жа тытунёвых і іншых вырабаў.**

Гродзенскі чыгуначны вакзал, адчыняюцца дзверы на ўваходзе ў зону памежнага і мытнага кантролю. Пасажыры ранішняга цягніка на Кузніцу прад'яўляюць білет, пашпарт і прыкладна з паўгадзіны чакаюць у зале пасадкі ў вагон. Хто едзе? Бачыш каталіцкіх святароў, а таксама, здаецца, студэнтаў і тых, хто накіроўваецца па аўтамабіль. Аднак пераважная частка пасажыраў — гэта так званыя «чаўнакі», у асноўным жанчыны сярэдняга ды пенсійнага ўзросту. Некаторыя з іх тут жа, у зале, атаварваюцца ў краме і праводзяць раскладку цыгарэт, для чаго выкарыстоўваюцца, напрыклад, панчохі.

Калі адчыняюцца дзверы на перон, то «цыгарэтчыкі», абганяючы адзін аднаго, бягуць да цягніка, прычым чамусьці менавіта да пярэдніх у кірунку руху ў Польшчу вагонаў. У выніку заднія вагоны амаль пустыя, але адразу бачна, што і яны не застаюцца ў баку ад нелегальнага бізнэсу. Такое ўражанне, што ледзь не ва ўсіх сядзеннях спрабавалі нешта схаваць, на такую ж думку наводзяць і шматлікія адтуліны ў вагонных сценах, столевым пакрыцці.

Менш за гадзіну — і цягнік ужо ў Кузніцы. І прыкладна столькі ж часу займае там кантроль, бо ў польскіх памежнікаў нешта здарылася з камп'ютарнай сістэмай. У выніку хто быў у пярэдніх вагонах — таго хутчэй і праверылі (вось, аказваецца, чаму туды «чаўнакі» беглі). Не турысты ж, а на працы, некаторыя нюансы якой можна было неўзабаве ўбачыць у будынку вакзала. Прайшоўшы кантроль раней за нявопытных, «чаўнакі», пэўна, ужо паспелі рэалізаваць палякам свой тавар. А тыя даставілі свой, пра што сведчылі аўтамабілі з польскімі нумарамі ля ўваходу ў вакзал. І нашы жанчыны, зусім не саромеючыся чужых вачэй, тут жа, у вакзальным памяшканні, апраналі на сябе living разнае адзенне. Як і пяць, дзесяць, пятнаццаць гадоў таму. Быццам час тут спыніўся...

Дарэчы, адзін з такіх перавозчыкаў нелегальнага тавару, на якога нядаўна звярнулі ўвагу ў пункце пропуску «Брузгі», апрануў на сябе... 50 адзінак адзення — майкі, шорты, брыджы, капры. І гэта — у летнюю спёку. Незадэклараваны тавар быў ацэнены ў паўтара мільёна рублёў, а ў прыборнай панэлі «Фальксвагена» схавалі жаночага адзення на тры мільёны. У выніку суд канфіскаваў не толькі тавар, але і аўтамабіль.

А бяспрэчнае «лідарства» ў затрыманні кантрабанды на выездзе з Беларусі, згодна з інфармацыяй памежных і мытных органаў, цяпер, пасля ўведзеных абмежаванняў, належыць гаручаму і цыгарэтам. Якія толькі хітрыкі не выкарыстоўваюцца... Напрыклад, у цягніку «Брэст — Малашэвічы» 5,5 тысячы пачкаў беларускіх цыгарэт былі схаваныя ў... паўвагоне пад рудой, выявіць іх дапамог службовы сабака. У пункце пропуску «Беняконі» затрымалі літоўца, які для цыгарэт (2 тысячы пачкаў) змайстраваў у машыне двайное дно. А ў пункце пропуску «Урбаны» супрацоўнікі Віцебскай мытні «прытармазілі» па шляху ў Латвію тры грузавікі, у якіх увогуле незаконна вывозілася больш за 3250 літраў саляркі — у каністрах, схаваных пад казыркам на даху кабіны, а таксама за кошт павялічэння аб'ёму дадатковых паліўных бакаў, што не прадугледжана заводам-вытворцам.

І сапраўды, не бывае пад месяцам нічога вечнага. Яшчэ ўчора — вывозь, колькі хочаш, а сёння — новыя эканамічныя рэаліі, і за «звышпланавае» гаручае трэба заплаціць падаткі. Многія «бензавозы» абурыліся, але ж няўжо яны думалі, што заўсёды будуць рухацца па «зялёным» канале? І ці ёсць запасны варыянт у жанчын, якія апранаюць на сябе адзенне на чыгуначным вакзале ў Кузніцы? І гэта ж скончыцца...

Сітуацыя з палівам, дарэчы, хвалюе і ўрад Літвы. З той толькі розніцай, што мы заклапочаны вывазам, а суседзі — увозам гаручага, з-за якога слаба прадаецца ўласнае. У гэтай сувязі, як паведамляе літоўская прэса, даволі спрэчным выглядае намер дазволіць запраўку канфіскаваным палівам... аўтамабіляў паліцыі. Выказваюцца меркаванні, што гэта скажае рынак, абсурдна ў дачыненні да легальнага бізнэсу нафтапрадуктаў. Ды і як можна дэкляраваць барацьбу з кантрабандным гаручым, а потым самім яго выкарыстоўваць?

А беларускіх перавозчыкаў паліва наша мытня папярэджвае, што не варта маніпуляваць з прыборамі яго кантролю. Няспраўны прыбор у аўтамабілі — значыць, мытныя органы прызнаюць бак поўным.

Дарэчы, ці ездзяць цяпер, пасля ўводу абмежаванняў на цыгарэты, нашы «чаўнакі» чыгункай у Кузніцу? Днямі пабываў на Гродзенскім вакзале перад адпраўленнем гэтага цягніка, і склалася ўражанне, што іх сярод пасажыраў стала значна менш. Пэўна, у асноўным ужо ездзяць за тым жа польскім адзеннем.

Сярод іншых пасажыраў прыцягнулі ўвагу хлопцы і дзяўчаты, якія накіроўваліся ў Польшчу з канцэртнымі касцюмамі, гітарай, акардэонам і іншымі музычнымі інструментамі. Значыць, памежжа «жыве» не толькі палівам, цыгарэтамі і «левым» адзеннем.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Дарога для еўрапейскай агароднiны ў Расію праз Беларусь зноў адкрытая

**Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, эпідэмічная сітуацыя па вострых кішэчных інфекцыях застаецца ў Беларусі спакойнай. Выпадкаў інфекцыі, выкліканай энтэрагемарагічнай кішэчнай палачкай, не зарэгістравана.**

21-22 чэрвеня ў Расіі, у Федэральнай службе па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека, па ініцыятыве еўрапейскага боку адбыліся перамовы з удзелам Камісара Еўракамісіі па пытаннях аховы здароўя Джонам Далі і Генеральнага дырэктара Генеральнага дырэктарата Еўракамісіі па ахове здароўя і абароне спажыўцоў Паолы Коджы. У выніку перамоў Расспажыўнаглядам былі адменены абмежаванні на ўвоз на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі і абарачэнне на тэрыторыі Расіі часткі гародніны, што вырабляецца ў краінах Еўрапейскага саюза, пра што галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Расійскай Федэрацыі Генадзь Анішчанка праінфармаваў Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь з просьбай аб прыняцці аналагічных мер.

Улічваючы вышэйсказанае, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь адмяніла абмежавальныя меры ў дачыненні гэтай прадукцыі, якая транзітам накіроўваецца праз Рэспубліку Беларусь у Расійскую Федэрацыю. Адпаведная інфармацыя ўжо накіраваная ў Дзяржаўны мытны камітэт, галоўным дзяржаўным санітарным урачам абласцей, горада Мінска і органам дзяржаўнага кіравання.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Важныя дробязі

## Спецыялісты знайшлі пазітыўныя бакі дэпрэсіі

Некаторыя вучоныя лічаць, што дэпрэсія можа быць карыснай або, як мінімум, стаць пазітыўным фактарам. Кожнаму, хто пакутуе ад дэпрэсіі ў любой форме, гэта падасца бязглуздзіцай. Многія спецыялісты сцвярджаюць, што клінічная дэпрэсія з'яўляецца страшнай хваробай. Аднак іншыя вучоныя лічаць, што некаторым яна можа быць карыснай. Людзі, якім удалося пераадолець дэпрэсію, становяцца больш моцнымі і трывалымі. Дэпрэсія можа стаць каталізатарам выжывання. Таксама існуе меркаванне, што дэпрэсія можа падштурхнуць чалавека да станоўчых змяненняў у жыцці, дапамагчы навучыцца на сваіх памылках і разабрацца ў сваіх жаданнях.

Галандскія вучоныя высветлілі, што людзі, якім удалося перамагчы дэпрэсію, працей спраўляюцца з жыццёвымі цяжкасцямі і маюць больш моцнае здароўе і псіхіку. Дэпрэсія дапамагае людзям выключаць з іх жыцця фактары, якія могуць выклікаць хранічны стрэс.

Вучоныя таксама перасцерагаюць, што антыдэпрэсанты не дапамагаюць у сітуацыі, калі чалавек не адмаўляецца ад падобнага ладу жыцця, які пастаянна выклікае дэпрэсію.

## БЯСПЕЧНЫХ ДОЗ АЛКАГОЛЮ ДЛЯ КІРОЎЦАЎ НЕ ІСНУЕ

**Амерыканскія навукоўцы даказалі: нават невялікія дозы алкаголю, якія не перавышаюць дапушчальны ўзровень, небяспечныя для кіроўцы.**

Дапушчальны ўзровень утрымання алкаголю ў крыві па амерыканскіх нормах 0,08 праміле, аднак нават меншыя дозы прыводзяць да аўтамабільных аварый са смяротным зыходам.

— Бяспечнай дозы алкаголю для ваджэння ўвогуле не існуе, — лічыць сацыёлаг Універсітэта Каліфорніі ў Сан-Дыега Дэвід Філіпс.

У часопісе «Згубныя звычкі» навукоўцы прадставілі вынікі тэсціравання вадзіцеляў з утрыманнем алкаголю ў крыві ніжэй за дапушчальны ўзровень. Аказалася, што такія кіроўцы часцей трапляюць у дарожна-транспартныя здарэнні (ДТЗ), чым цалкам цвярозыя. Яны часцей перавышаюць хуткасць, радзей выкарыстоўваюць рэмень бяспекі і звычайна першымі ўразаюцца ў чужыя машыны.

Навукоўцы вывучылі статыстыку аб усіх 1 495 667 жыхарах ЗША, якія траплялі ў ДТЗ з 1994 года па 2008 год, і высветлілі, што нават калі ў крыві кіроўцы ўтрымлівалася невялікая доза алкаголю, то аварыі заўсёды мелі больш сур'ёзныя наступствы. Навукоўцы таксама ўстанавілі, што больш цяжкія ДТЗ здараюцца па выхадных днях паміж 8 гадзінамі вечара і 4 гадзінамі раніцы з чэрвеня па жнівень. Дэвід Філіпс выступае за змяншэнне гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі алкаголю ў крыві і прыводзіць прыклад Швецыі — 0,02 праміле, і Японію — 0,03 праміле.

Трэба дадаць, што ў ЗША па віне п'яных кіроўцаў гінуць 30 чалавек штодня: кожныя 48 хвілін рэгіструецца новая ахвяра...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 25.07.2011 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на три года для использования в целях размещения офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств), оказания услуг по бытовому обслуживанию населения.**

| Организатор аукциона | РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно. ул. Горького, 87 А. | |
|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 |
| Местонахождение имущества | г. Гродно, ул. Пестрака, 36, здание АТС. | Гродненская обл., г. Лида, ул. Чапаева, 3, здание АТС. |
